бярозка

№05

№ 05/2020(1104)

ISSN 0320-7579

12+

Палілог

А ўсё-такі, напэўна, добра ведаць, што там, дзе гарыць святло, хтосьці можа сядзець і думаць пра цябе.

«Смяшарыкі»

Хочацца, каб гэтую кнігу больш не экранізавалі

...і не таму, што фільм кепскі

Галоўная гераіня Джо з фільма Грэты Гервіг «Маленькія жанчыны» — пісьменніца-бунтарка з моцным характарам. Яна адчувае на сабе ціск грамадства, але яно няздольнае яе зламаць. Гэтая дзяўчына характарам мацнейшая за любога мужчыну ў фільме.

Рэжысёрскі дэбют Грэты Гервіг «Лэдзі Бёрд» таксама быў пра сталенне жанчыны. Абодва фільмы падобныя не толькі тэмай, але і галоўнымі гераінямі — творчыя бунтаркі з характарам, якіх іграе адна і тая ж актрыса Сірша Ронан.

Фільм «Маленькія жанчыны» — экранізацыя кнігі пра пісьменніцу і яе раман, у якім яна распавядае пра сваё дзяцінства і сталенне. У фільме кадры з яе цяперашняга жыцця чаргуюцца з дзіцячымі ўспамінамі, на падставе якіх яна стварае сваю гісторыю. Героі рамана — сям'я пісьменніцы: яе сёстры і бацькі. Старэйшая сястра Мэг вельмі разважлівая і марыць стаць актрысай. Далей па старшынстве ідзе Джо — апавядальніца гісторыі, потым Бэт, якая неверагодна любіць музыку і гатова ахвяраваць сабой дзеля іншых людзей. Самая малодшая Эмі. У яе дзве мары: стаць вялікай мастачкай і знайсці сабе багатага мужа, каб яе сям'я ні ў чым не мела патрэбы. У фільме можна прасачыць паэтапны працэс сталення дзяўчынак: як яны праходзілі праз першае каханне, безадказныя пачуцці, аддаленне блізкага чалавека, смерць сябра і як яны змяняліся. Нягледзячы на тое, што дзеянне ў фільме адбываецца ў 1860-х гадах у ЗША, фільм цікавы і цяпер. Мы можам з героямі прайсці праз усе этапы сталення, пасуперажываць ім і зразумець, як дзейнічаць у складаных сітуацыях.

Я згадваю дзяцінства. Я апрануты: на мне чаравікі, куртка. І калі я ўжо збіраюся выходзіць з дому, мама мне крычыць з кухні: «Апрані шапку». Не хачу, супраціўляюся, але апранаю. Але мама ж не ведае, цёпла мне там, горача ці халодна.

Ніхто, акрамя мяне, у прынцыпе не ведае. І так заўсёды адбываецца, калі на цябе ціснуць, ігнаруюць твае жаданні, нават калі так робяць дзеля твайго ж шчасця.

Так ціснула і цётка на сясцёр, падштурхоўваючы іх да шлюбу і распавядаючы, як павінна паводзіць сябе дзяўчына. Толькі шлюб — гэта неяк больш сур'ёзна, чым шапка. У тым грамадстве, дзе яна жыве, жанчына можа быць шчаслівая, толькі калі выйдзе замуж за багатага чалавека. Цётачка транслюе ўсе каштоўнасці таго грамадства, таму яна кажа ад яго імя.

Грамадства прымушае нас выконваць свае правілы, таму што яно лічыць, што тады мы ўсе будзем жыць лепш. Часам яно забывае, што «ўсе» складаюцца з розных людзей з рознымі жаданнямі і пачуццямі. І яно можа памыляцца — і перашкаджаць людзям жыць. Грамадства навязвае сваю волю людзям, а тыя адчуваюць сябе ненармальнымі, калі яны не адпавядаюць грамадскім нормам. Так адчувала сябе Джо, калі яна разумела, што паводзіць сябе як стэрэатыпны хлапчук-гарэза: бегае і сябруе з хлопчыкам, а не ходзіць на балі і захапляецца сукенкамі.

Мужчыны ў фільме настолькі другарадныя, што, здаецца, можна абысціся і без іх. У адрозненне ад жанчын, мужчыны трапляюць у кадр ненадоўга, а ўсе, хто ёсць, іграюць невялікую ролю ў гісторыі. І гэта дапамагае мужчынам стаць на месца жанчыны ў многіх сітуацыях. Для мяне такой сітуацыяй стала сцэна з Мэг у краме. Калі яна была са сваёй заможнай знаёмай, то купіла тканіну для сукенак, якую не магла сабе дазволіць. Калі б я глядзеў на гэта збоку, то толькі б падумаў, што дзяўчына не хоча ўпасці ў вачах знаёмай. Але калі я гляджу на гэта знутры, то лепш разумею яе. Гэта не толькі пра кавалак тканіны, але і пра яе становішча ў грамадстве і незадаволенасць ім. Набыццё тканіны — гэта роспач і зрыў, калі здаецца, што так больш немагчыма.

І тут цікавыя лёсы сясцёр у яшчэ больш жорсткі час, чым зараз, калі лічылася, што ў жанчыны павінна быць толькі адна мара — выйсці за паспяховага і багатага мужчыну і быць узорнай гаспадыняй. Джо, напрыклад, сказала, што не хоча ніколі выходзіць замуж, і за гэта атрымала кляймо вар'яткі ад цёткі. Мэг выбрала гувернёра, які, адпаведна, зарабляе гэтаксама няшмат, і атрымала тое ж самае: «вар’ятка». Эмі вырашала класічнае пытанне: выйсці за вельмі багатага, паспяховага і нецікавага мужчыну альбо за абаяльнага гультая, якога яна горача кахае. 1860-ыя, але калі паазірацца зараз, то не тое, каб вельмі моцна ўсё змянілася.

Ці можна зарабіць мастацтвам? Многія, даведаўшыся адказ, адмаўляюцца ад мастацтва. Так і зрабіла Мэг, якая марыла стаць актрысай, але калі зразумела, што гэтым цяжка зарабіць, то кінула мастацтва і стала займацца гаспадаркай. Як і многія людзі, якія здрадзілі мары, яна доўга шкадавала пра гэта. Джо адказала на пытанне пра грошы па-іншаму. Яна пайшла на кампраміс, стала пісаць толькі тое, што фінансава выгадна, таму што цяжка зарабіць літаратурай інакш. Многія пісь-

меннікі і зараз жывуць не за кошт сваіх твораў, а за кошт іншай працы: журналістыкі, выкладання, крытыкі чужых твораў. Што ўжо казаць пра яшчэ не вядомых пачаткоўцаў-пісьменнікаў, як Джо? Калі хочаш стаць пісьменнікам ці пісьменніцай, трэба быць гатовым, што табе прыйдзецца сумяшчаць гэта з іншай працай.

Многія мастакі вельмі амбіцыйныя, яны хочуць стаць выбітнымі і застацца ў гісторыі — яны баяцца быць пасрэднымі. Такі страх адчула і Эмі. Яна хацела стаць вядомай мастачкай, але баялася быць творцай сярэдняй рукі. Таксама жанчыне было цяжэй прабіцца да вяршыні з-за прэсінгу грамадства: адукацыя для дзяўчат была няякасная, да іх захапленняў мастацтвам ставіліся толькі як да забавы, якую ніхто не хацеў развіваць. Жанчыны не маглі прысвяціць увесь свой час мастацтву, як гэта рабілі многія мужчыны-мастакі, бо на жаночых плячах абавязкова былі хатнія справы, дзеці. Ім было цяжка, а часам і немагчыма трапіць у прэстыжныя навучальныя ўстановы. Грамадскія абмежаванні даходзілі да маразму. Жанчыне элементарна не давалі дасягнуць прафесіяналізму. Яшчэ ў XIX стагоддзі студэнткам-мастачкам у Каралеўскай акадэміі ў Лондане нельга было хадзіць на заняткі па маляванні аголенай натуры. У той час, калі здольнаць маляваць аголенае цела лічылася прыкметай майстэрства.

Стагоддзі змяняюцца, але многія праблемы застаюцца ранейшымі. Жанчыны ўжо атрымалі многія правы, даказалі, што яны могуць працаваць нароўні з мужчынамі, але яны ўсё роўна яшчэ адчуваюць на сабе паблажлівы погляд, які можа раздражняць не толькі саміх жанчын. «Маленькія жанчыны» — гэта погляд аўтаркі на праблемы дзяўчат, якія яна сама адчула. Бо рэжысёр і сцэнарыст гэтага фільма жанчына. Спадзяюся, што хтосьці задумаецца пасля фільма, як ён можа дапамагчы жанчынам, чаму існуе свята Восьмага сакавіка і ці тое гэта свята, якім мы звыклі яго бачыць. Як хочацца, каб гэтую кнігу больш не экранізавалі. Бо кожная наступная экранізацыя будзе казаць толькі пра тое, што гэта ўсё яшчэ актуальна.

Максім Жук

Ахова птушак Бацькаўшчыны

Бёрдвочынг — гэта назіранне за птушкамі.

Нават калі вы жывяце ў горадзе, то можна паглядзець на бліжэйшыя кусты і дрэвы каля дома, а потым — што адбываецца ў найбліжэйшым парку, дзе быццам бы не было чаго рабіць.

Які праект:

Грамадская арганізацыя «Ахова птушак Бацькаўшчыны» (АПБ) — найбуйнейшая прыродаахоўная арганізацыя Беларусі. Гэта больш за дзве з паловай тысячы ўдзельнікаў і валанцёраў, больш за 40 тысяч прыхільнікаў, 14 аддзяленняў і больш за 130 школьных клубаў па ўсёй краіне.

Што робіць:

- Вывучае і захоўвае біяразнастайнасці, асабліва разнастайнасці дзікіх птушак.
- Выяўляе, вывучае, захоўвае і аднаўляе прыродныя тэрыторыі, важныя для захавання біяразнастайнасці.
- Павышае экалагічную свядомасць насельніцтва.
- Садзейнічае ўстойліваму выкарыстанню прыродных рэсурсаў.

Як далучыцца:

- Знайсці месца, дзе тусуецца досыць птушак (нават калі гэта нехта звыклы).
- Паглядзець на сайце АПБ, што гэта за птушкі (там і галасы можна паслухаць!).
- Глядзець, як птушкі стасуюцца адна з адной, што ядуць, з кім жывуць у згодзе.
- Запісаць, што знайшлі, у нататкі (ці можна спампаваць круты дадатак на тэлефон).
- Прайсціся па старонках АПБ у сацсетках, каб сачыць за чужымі назіраннямі ў інстаграме і карыстацца стыкерамі ад Nollaig Lou у тэлеграме.

Навошта вам гэта рабіць:

- Даведацца пра тое жыццё, што адбываецца вакол вас, а вы і не заўважалі.
- Палюбіць тых птушак, пра якіх можна клапаціцца потым, зімой, — падкормліваць і домікі рабіць.
- Бяспечна займацца нечым на вуліцы нават разам з сябрамі (памятаем: сацыяльная дыстанцыя!).
- Знайсці такіх самых зацікаўленых, у каго назіранні ў бліжэйшым парку па графіку, каб стасавацца — абменьвацца досведам, ладзіць сустрэчы, займацца валанцёрствам ці проста падысці і запытацца: «А вось я не магу знайсці тую птушку, не ведаеш, дзе тут шукаць?»

Каханне ёсць рызыка, ці Як выглядае аб'юз

Білі Айліш — маладая амерыканская спявачка, якую называюць першай зоркай пакалення Z. У 2020 годзе яна атрымала ўсе чатыры намінацыі прэміі «Грэмі». Яе музыка звязана з папулярнай культурай серыялаў, сацыяльных сетак і камп'ютарных гульняў.

Асноўная тэматыка твораў — праблемы псіхічнага здароўя, што актуальна для самой Білі — спявачка хварэе на дэпрэсію. У песнях Білі кажа, што кожны дзень замагаецца з сабой, бо ненавідзіць сябе, не хоча быць сабой. Яна не скардзіцца на гэта блізкім, і толькі праз творчасць выносіць уласны боль вонкі. Дзяўчына паказвае слухачам: нават у самых паспяховых людзей неабавязкова ўсё добра, усе мы маем праблемы і змагаемся з імі, бо жыць увогуле няпроста.

Кліп «Закладнік» (Hostage), выпушчаны Білі Айліш у 2017 годзе, расказвае, як страх можа знішчыць каханне. Ён нараджаецца ў душы галоўнай гераіні і прымушае трымаць у палоне яе каханага. Гледзячы відэа, я плакала: мабыць, таксама баюся згубіць дарагіх мне людзей і адчуць адзіноту. Мо' гэта і ёсць прычына, чаму я часам надакучваю сябрам, а часам знікаю з іх жыцця, каб не надакучыць? Мо' праз той самы страх я не ўздымаю важныя пытанні і працягваю пакутаваць, не разумеючы, у чым праблема ў стасунках? А раптам, каб яе вырашыць, дастаткова пазбавіцца страху і паразмаўляць?

Гераіня кліпа таксама абірае прасцейшы для сябе шлях. У яе выпадку гэта

аб'юзіўныя стасункі. Дзяўчына няздольная быць разам з каханым, давяраць яму, даваць свабоду. Таму ён становіцца ахвярай маніпулятара: яго звязваюць, б'юць, гуляюць з яго пачуццямі — даюць надзею, падпускаюць бліжэй, а пасля адштурхоўваюць. Герой пакутуе, паступова агеньчык у яго вачах згасае, фізічная моц знікае. Тым часам захопніца заўжды перамагае: знаходзіцца вышэй, апынаецца больш дужай, а на яе вуснах зіхаціць усмешка — здаецца, яна шчаслівая, задаволеная магчымасцю валодаць каханым.

Галоўны рухавік кліпа — барацьба. Паміж палонным і захопніцай, блізасцю і адзінотай, каханнем і болем, страхам і рашучасцю, надзеяй і адчаем. Маленькія бойкі складаюцца ў адну вялікую вайну, якая хутчэй знішчыць кожны з бакоў, чым вызначыць пераможцу. І вынік гэтай вайны мы бачым у фінале кліпа, калі замест утульнага пакоя застаецца прастора без мэблі, замест спакою на твары захопніцы — безнадзейнасць, замест соннага каханага — маральна знішчаны закладнік.

Аб'юз — гэта фізічныя ці псіхалагічныя праявы гвалту да чалавека, незалежна ад узросту і полу. Літаральна з англійскай мовы слова abuse перакладаецца як «злоўжыванне», «кепскае стаўленне». Часцей за ўсё аб'юзерам (асобай, якая маніпулюе ахвярай і прымушае да пэўных рэакцый насуперак жаданням ахвяры) становіцца блізкі чалавек: бацька, жонка, сябр, калега. Менавіта таму ахвяры рэдка заўважаюць праблему і прызнаюць яе, а тым больш спрабуюць вырашыць. Калі раней для масавай аўдыторыі аб'юз быў табу альбо выдумкай, зараз грамадства пачынае прызнаваць праблему, абмяркоўваць, даследаваць яе і змагацца з ёй.

Унутраны канфлікт гераіні прымушае яе чыніць боль каханаму. Яна не можа выбраць паміж каханнем і адзінотай: у абодвух выпадках рызыкуе. Калі абярэ каханне, з галавой нырне ў гэты вір, яна рызыкуе адчуць боль разбітага сэрца. Калі абярэ адзіноту, рызыкуе застацца адна з уласнымі праблемамі, нікому не патрэбная, на яе думку, і няшчасная. Не жадаючы рызыкаваць, яна абірае трэці варыянт — цалкам абмяжоўвае свабоду каханага — і фізічную, і духоўную, і ментальную. Цяпер ён няздольны разбіць яе сэрца, бо яго воля належыць захопніцы. Толькі аб'юзерка вырашае, што палонны будзе адчуваць да яе, таму яна не рызыкуе.

Нечакана роля аб'юзера дастаецца, задалася б, бяскрыўднай дзяўчыне, а роля палоннага — моцнаму хлопцу, які мусіў быць здольным абараніць сябе. Маленькая Білі з каляровымі валасамі, параненымі каленямі і позіркам у нікуды здзекуецца з дужага хлопца фізічна і маральна. І ён не можа супрацьстаяць гвалту. Аказваецца, аб'юзер можа хавацца за самым бязвінным тварам. Дастаткова ненадоўга падпусціць яго бліжэй, каб апынуцца ў палоне, з якога будзе складана вырвацца нават псіхічна ўстойліваму чалавеку.

Адзіная дэталь, якая аб'ядноўвае герояў, — залатыя ланцужкі на іх шыях. Білі спявае: «Золата на кончыках тваіх пальцаў. Твае пальцы на маёй шчацэ. На тваіх вуснах сусальнае золата». У інтэрв'ю карэйскаму выданню Universal Music спявач-

ка сказала, што ў гэтай песні яна і ёсць золата — самы каштоўны метал, і самае каштоўнае, што ёсць у жыцці каханага.

Што сімвалізуе золата? Мая першая думка — каханне. Але ж словы «золата фальшывае, а сапраўднае каханне раніць» прымусілі задумацца. Калі лірычная гераіня здзекуецца з палоннага, хіба гэта можа быць тое светлае, чыстае, шчырае каханне, якім мы звыклі яго ўяўляць? Мабыць, золата ў творы — сімвал нездаровых стасункаў герояў, іх прывязанасці адзін да аднаго, заснаванай на гвалце і болю.

Колеры — адзіны інструмент у відэа, з дапамогай якога аўтар ацэньвае ўчынкі герояў. І ў пачатку, і ў канцы кліпа Білі сядзіць на прыступках і зверху глядзіць на хлопца. На пачатку кліпа прастора белая, на яго працягу запаланяецца яскравымі, але непрыемнымі воку адценнямі жоўтага, сіняга, чырвонага, напрыканцы святло быццам зусім сыходзіць, знікае, пакідаючы Білі ў цёмнай прасторы. Калі спачатку глядач можа спадзявацца на happy end, то ў канцы надзеі не застаецца: жадаючы зберагчы каханне болем і гвалтам, захопніца знішчае пачуццё.

У кліпе няма ні гадзінніка, ні натуральнага святла, па якіх глядач і героі маглі б зразумець, як хутка ідзе час. Мы можам толькі параўнаць працягласць танца кахання з наступнай барацьбой: з чатырох хвілін на працягу толькі першай героі не адштурхоўваюць адзін аднаго, атрымліваюць асалоду ад таго, што яны разам. На жаль, часта ў жыцці гэтаксама: знаёміцеся з новым чалавекам, захапляецеся ім, нейкі час вам цудоўна разам. Але хутка захапленне праходзіць, застаецца неабходнасць працаваць над стасункамі. Не ўсе гатовыя траціць на іншага чалавека свой час, клопат, любоў, нервы. І пакуль адзін укладае ўсяго сябе ў каханне, іншы шукае прасцейшыя спосабы трымаць чалавека побач. Часам гэта маніпуляцыі, агрэсія і нават фізічны гвалт — якраз гэтыя праявы аб'юзу мы бачым у гісторыі.

Прастора кліпа — абмежаваны пакой з белымі сценамі. Там ёсць лесвіца і дзверы, але праз іх немагчыма выйсці. Героі замкнёныя, быццам палонны не адзін, а

абое. Межы пакоя змяняюцца, і разам з імі змяняецца расстаноўка сіл: закладнік становіцца ўсё слабейшым.

Спачатку пакой размяжоўваецца на два асобныя. Адзіная сувязь паміж імі — акно. Яно падобна да акна ў камерах з крымінальных фільмаў. Для злачынцы гэта люстэрка: ён бачыць толькі сябе. З адваротнага боку шкло празрыстае, таму следчы можа назіраць за падазраваным, застаючыся незаўважным. У кліпе злачынца-захопніца займае месца следчага і назірае за пакутамі палоннага, становячыся паступова ўсё больш абыякавай. Тым часам як для ахвяры адзінота, жыццё без каханай становяцца невыноснымі, і ён літаральна прадзіраецца праз сцяну.

Толькі ўявіце: каханне зрабіла заложніка настолькі моцным, што ён здзейсніў немагчымае — на імгненне стаў мацнейшым за аб'юзерку. Каханы амаль здолеў пацалаваць яе — упершыню за ўсю гісторыю! У гэты момант глядач разам з палонным спадзяецца, што нават у аб'юзіўных стасунках можа здарыцца светлы момант. Але дзяўчына гуляе пачуццямі хлопца і, падпускаючы яго вельмі блізка, адштурхоўвае. І чым бліжэйшымі становяцца іх стасункі, тым большы боль яна можа чыніць яму з кожным разам.

Білі Айліш, па дэпрэсіўнай звычцы, руйнуе ілюзіі гледачоў пра тое, што каханне абавязкова будзе шчаслівым. Але спявачка падштурхоўвае задумацца, што ёсць каханне і як яго захаваць. Зразумей гераіня сапраўднасць пачуццяў і набярыся мужнасці аддацца ім — магчыма, канец кліпа быў бы светлым. І ў прамым, і ў пераносным сэнсе. Дык можа варта хоць раз у жыцці рызыкнуць? Бо хто не рызыкуе, той не кахае па-сапраўднаму.

Паліна Забела

Пра тое, як чуць адзін аднаго

Мы знайшлі крутую выкладчыцу малявання з Бабруйска, якая распавяла, як яна стасуецца са сваімі вучнямі. Я памятаю, як мае лісты з акварэлямі запіхвалі пад ваду з жорсткім «перамалёўвай». Ну, зразумела, спачатку прасушвай, як астатнія з такімі ж вільготнымі лістамі, а потым перамалёўвай. Мабыць, менавіта праз тыя самыя лісты пад кранам я больш не малюю, але пасля сустрэчы з чалавекам, якога хвалюе эмацыйны стан вучня на ўроку, захацелася згадаць, што такое акварэль. Гутарка з Марыяй Шпак.

Пра першы раз

Я павінна была працаваць рэкламным дызайнерам. У нас было пяць курсаў, і апошнія з іх былі неяк праз сілу: перагарэла. Маляваць мне, наадварот, захацелася, але я не ведала, куды мне падацца. Як мастак я тады была — ну, так, сярэднячок: быццам бы малюю добра, але не настолькі, каб пайсці ў распрацоўку камп'ютарных гульняў або ілюстратарам кніг, часопісаў. Я адчувала сябе ў гэтым занадта няўпэўнена. А мама кажа: «А ідзі ў "Цэнтр дадатковай адукацыі" — паспрабуй дзяцей павучыць». Вось так яно і атрымалася.

Марыя

Мне было цікава сябе праверыць: як гэта будзе? На першы занятак у мяне быў падрыхтаваны тэкст — і я пачала казаць міма тэксту. Але што дзіўна: калі разгубілася ў аўдыторыі як студэнтка — гэта зусім іншае. Там ты баішся, што табе паставяць дрэнную адзнаку, выганяць ці залік не паставяць. А тут ты прыйшла, «затупіла», а дзецям усё роўна. І праз гэта я пачала адчуваць сябе больш вольна.

На першым занятку я стаю, мне страшна — і трэба пачаць нешта рабіць. Наогул што заўгодна, і я проста кажу: «Добры дзень, дзеці. Мяне клічуць так-та, а вас як завуць?» Калі ты спытаеш: «Як у цябе справы?», то яны адкажуць «нармальна» — і маўчаць. А калі спытаеш, які ў цябе любімы прадмет у школе, то гутарка пойдзе сама сабой. Ты разнявольваешся: «Тэма нашага ўрока...» — і пачынаеш.

Пра тое, дзе дазволена падпаліць школу

Мая вучаніца ходзіць у мастацкую школу і паралельна бегае да мяне. Ёй кажуць, што ў яе дрэнная штрыхоўка, але не кажуць чаму. Ёй кажуць, як не трэба, але не тлумачаць, як мае быць. У мяне было гэтаксама, калі я вучылася: я ведаю, дзе ў мяне памылкі, але не ведаю, куды рухацца, каб зрабіць добра. Зразумелая справа, што выкладчык не можа дакладна сказаць, што ты павінен зрабіць, таму што гэта твой малюнак, твой праект, твой дызайн. Але даць табе нейкі арыенцір ён абавязаны.

Спачатку, вядома, было страшна, што я магу нешта не так сказаць, кагосьці пакрыўдзіць: у мяне было шмат негатыўнага вопыту з настаўнікамі. Гэта вельмі моцна ўплывала на маё наступнае жыццё: напрыклад, я гадоў дзесяць не ляпіла ў прынцыпе, проста таму што выкладчык вельмі жорстка мяне раскрытыкаваў. А нядаўна я купіла пластылін — і мяне «панесла».

Шмат што залежыць ад выкладчыкаў. Яны, можа быць, добра малююць, у іх ёсць разуменне, як усё павінна выглядаць. Але яны зусім не ўмеюць перакладаць гэта на «чалавечую» мову. Да іх прыйшлі дзеці, якія не ведаюць вось гэтых усіх мудрагелістых слоў. Слова «атмасфера» — гэта нешта з урока геаграфіі. А што значыць «атмасфера» ў мастацкім кантэксце, яны не ведаюць. І тут трэба гаварыць ясна, простымі словамі, без паблажлівага стаўлення і тэрмінаў. Часам я проста гляджу відэа на ютубе пра кампазіцыю і думаю: як растлумачыць кампазіцыю пяцікласніку? Ён нават слова «кампазіцыя» можа яшчэ не ведаць.



Што я тады зрабіла з не менш складанай тэмай перспектывы: адразу намалявала на камп'ютары лінію далягляду, дзве кропкі і хмарачосы — і раздрукавала. І кажу: «Спадарства, глядзіце: вось у вас усё ўжо ёсць, вам

трэба намаляваць толькі вокны, рэкламныя шчыткі, шыльды, графіці, дзверы, вітрыны — усё, што ў галаву лезе». Вучні адразу трохі занерваваліся: зноў складаная тэма. А я кажу: «Затое ведаеце што? Можна ўсё што заўгодна. Нават падпаленую школу намаляваць, я дазваляю, але каб гарэла па перспектыве». І праца прасцей ідзе адразу.

Пра тое, што (не)элементарна і (не)відавочна

Я ў сваіх сацыяльных сетках пісала: не магу дзяцей навучыць карыстацца лінейкай. І людзі пішуць: «Да гэтага часу не магу, мне ніхто не патлумачыў, як гэта рабіць». Аказалася, што многія дарослыя людзі не ўмеюць! Гэта элементарна і відавочна, але толькі тады, калі ты гэта ўжо ўмееш. І з мастацкай адукацыяй тое ж самае.

Часам у іх з'яўляюцца нейкія цяжкасці, якіх я наогул не чакала. Прыходзіцца спыняцца, адкладаць тэму ўбок: «Яблычкі памалюем потым, зараз давайце пазмешваем фарбы». Так, трэба да кожнага падыходзіць, сядзець, тлумачыць такія элементарныя рэчы. Ажно да таго, як карыстацца лінейкай. Яны могуць прыкласці лінейку і сказаць: вось гэтая штука — дзесяць сантыметраў. Але яны не могуць прыкласці так, каб прачарціць прамую лінію: іх не навучылі — прытрымліваеш лінейку і пальцы абводзіш выпадкова. Тое ж самае і з маляваннем.

Я люблю маляваць, люблю Гары Потэра, я гуляю ў Sims па вечарах.

Я зачытвалася так па-вар'яцку, што ў мяне рэзка падскочылі ацэнкі па рускай мове і літаратуры. Гэта шмат дало мне ў плане разумення розных важных рэчаў: як важна быць добрым, як важна не задзіраць чалавека, калі ён чымсьці адрозніваецца. Як, напрыклад, Хагрыда цкавалі за тое, што ён напалову велікан, ці як Герміёну дражнілі за тое, што яна бруднакроўка. Гэта не вызначае, якія яны людзі.

А Sims... Мне, напэўна, не хапае сваёй асабістай прасторы па жыцці: ніколі не было свайго пакоя ці такога месца, дзе можна пасядзець і падумаць. А тут можна пабудаваць вялізны балкон з лавачкай, нават комінам — комін проста на вуліцы — чаму б і не, гэта ж Sims! Мне так падабаецца ўяўляць больш разняволены, больш камфортны побыт, не такі, як у мяне. І мне проста падабаецца будаваць хаты, вядома!

Я прыглядаюся да ўсіх і спрабую зразумець, што і чаму не атрымліваецца. Хтосьці няўважліва слухаў мяне, я не так патлумачыла ці ім проста не хапае ведаў? І я заўсёды кажу: «Пытайце, калі нешта не разумееце». Вучні таксама пачуваюцца вальней з часам, калі бачаць, што я не крычу на іх з-за таго, што яны задаюць дурныя пытанні. У мяне была такая настаўніца, якая пыталася: «У вас ёсць пытанні па тэме?» Я падымала руку, пыталася, і яна на мяне крычала: «І што тут незразумелага?!»

Я не хачу быць такой: няхай пытанні здаюцца дурнымі, але няхай яны задаюць іх. Так я разумею, што менавіта яны не разумеюць, і карэктую праграму.

Пра неабходнасць тлумачыць

Адзін хлопец да мяне прыходзіць толькі таму, што яму падабаецца стасавацца з людзьмі. Ён увесь час нешта распавядае, таму ў класе пастаянна ідзе нейкая гутарка. Такі добры тыпаж балбатуна, які аб'ядноўвае ўсіх у групу. Ён больш хоча стаць праграмістам, чым мастаком, але калі-небудзь ён захоча зрабіць гульню і яму патрэбны будзе мастак: а дзе яго ўзяць, калі ён не будзе тусавацца сярод мастакоў? Можа быць, ён не хоча маляваць, але ён хоча стасавацца з творчымі людзьмі. Дык чаму б і не? Ён не парушае дысцыпліну, а проста прыходзіць, таму што яму тут падабаецца.

Я вырашыла не ствараць вобраз настаўніка-робата, які распавядае тэму. Я не той настаўнік, якога бачыш ў гандлёвым цэнтры і здзіўляешся: «Ого, у настаўніка ёсць жыццё! Як нечакана: гэта чалавек!» Яны і так ведаюць, што ў мяне ёсць жыццё, таму што я пра яго расказваю. А падлеткі адгукаюцца менавіта ў адказ. Ты ім нешта распавядзеш пра сябе — і яны нешта раскажуць пра сябе. Яны ведаюць, што іх тут пачуюць.

Вось, бывае, прыходжу на ўрок і, напрыклад, не выспалася. І я кажу: «Дзеці, я не выспалася, я сёння буду тупіць». І адна вучаніца кажа: «Так выдатна, што вы гэта тлумачыце, таму што так я разумею, чаму так адбываецца. Вы не падыходзіце не таму, што я нешта не так зрабіла, а таму, што вы не выспаліся».

Пра гутаркі

Падлеткі больш дзеляцца чымсьці непрыемным. І я думаю: чаму яны дзеляцца са мной? Па-першае, я не нашмат старэйшая за іх — у нас розніца дзесяць — пят-

наццаць гадоў. Я памятаю, што такое школа, экзамен. Здавала тое самае ЦТ — і тлумачу, на што трэба звярнуць увагу, каб яны разумелі, што не так усё страшна.

Многія дарослыя абясцэньваюць пачуцці падлеткаў, не ўсведамляючы — не таму, што хочуць прынізіць падлетка, а таму, што яны гэта прайшлі, і гэта ўжо не здаецца страшным. Такая памылка таго, хто выжыў.

Вучні прыходзяць пагутарыць з нагоды падлеткавых праблем, калі ў школе нейкія непаразуменні з аднакласнікамі ці пачынаецца першае каханне. І для іх гэта ўсё ўпершыню — яны не ведаюць, як рэагаваць. Яны проста бяруць тую мадэль паводзінаў, якую ведаюць, якую бачаць у бацькоў, напрыклад. І я пачынаю разбіраць з імі: калі адбываецца так, то можна зрабіць вось так, вось так і вось так — глядзі, як шмат варыянтаў.

Пра дыстанцыю

Але тут таксама трэба трымаць дыстанцыю. Вучням трэба распавядаць такія рэчы, якія ты можаш распавесці незнаёмцу ў цягніку: я люблю жоўты колер, была на такім-та фестывалі, глядзела вось той — раю! — фільм.

Калі гаворка заходзіць пра сацыяльныя сеткі, то я так і кажу: спадарства, вы прабачце, але я ў сацыяльных сетках вас дадаваць не буду, не таму што я не хачу з вамі сябраваць або стасавацца, а таму што нам трэба трошкі размяжоўваць светы: вось тут вось я ваш настаўнік, а ў рэальным жыцці я ўжо не ваш настаўнік — цётачка, з якой вы знаёмыя.

Яны слухаюць з увагай і ставяцца да гэтага з разуменнем. Яны нават, напэўна, не заўсёды чакаюць, што з імі могуць размаўляць як з дарослымі, што кажуць не проста «таму што нельга, нельга і ўсё!», а тлумачаць, чаму нельга. Атрымліваюцца ўрокі пра тое, як стасавацца.

Мне робіцца няёмка, калі яны кажуць нешта, праз што мне падаецца, быццам яны знайшлі мяне ў сацыяльных сетках. Тыя акаўнты, дзе я не падпісаная сваім імем, дзе пішу фанфікі і выкладваю арты. Я не супраць, але калі яны будуць пакідаць гэта ў сваім коле, у коле аднагрупнікаў, якія ходзяць да мяне: прачыталі, паставілі лайк, пахіхікалі — і на гэтым спыніліся. Я распавядала ім гісторыі выкладчыц, якіх звальнялі за аватарку ў купальніках ці допісы ў сацыяльных сетках, і аргументую, што менавіта праз гэта не хачу, каб мае сацыяльныя сеткі неяк усплывалі. «Вы, можа, і разумееце, што гэта маё асабістае жыццё і я маю на яго права, а вось нейкая ваша сяброўка гэтага не зразумее. Калі вы знойдзеце мяне ў сацыяльных сетках, то, калі ласка, чытайце, але нікому не паказвайце — і я буду вам ўдзячная за гэта».

Святлана Курганава
малюнкі — вучняў Марыі Шпак

Гарады Беларусі

Загадкі

Пра горад, вядомы ад краю да краю,
Здаўна існавала легенда такая.
Жыў тут на Свіслачы дужы млынар.
Дзіўны надзвычай ён быў гаспадар.
На працу выходзіў з першым праменнем.
Толькі муку вось малоў ён з камення.
Затым стаў дружыну з дужых людзей
Збіраць неўтаймаваны млынар-чарадзей.
З гэтай дружыны народ утварыўся,
Які паступова ля млына сяліўся.
Горад узнік тут са звонкаю назвай,
Якую вы скажаце, пэўна, адразу.

Горад архітэктурай сваёй знакаміты.
Калі існавала Рэч Паспалітая,
Зрабіў рэзідэнцыяй Стэфан Баторый
Горад, дзе паркі, палацы, саборы
Чаруюць, нібыта валошкі ў жыце.
Як называецца горад, скажыце.

Нямала аб ім ужо складзена вершаў.
Быў з гарадоў Беларусі ён першым,
Які атрымаў Магдэбургскае права,
Што азначала і вольнасць, і славу.
Узнік ён як крэпасць на самай мяжы.
Які гэта горад, хутчэй адкажы.
Вабіць усіх ён сваёй прыгажосцю.

З краін самых розных бываюць тут госці.
Тут старадаўні чароўны напеў
У шолаху паркавых чуецца дрэў,
Што акружаюць палац Радзівіла,
Раскоша якога многіх дзівіла.
Гэта не Лондан і не Парыж,
Гэта ўсім вам вядомы …

Быў ён сталіцай вялікага княства,
Нібыта магутны арол сярод птаства.
Княжыў у ім Усяслаў Чарадзей,
Радзімаю быў ён славутых людзей:
Францішка Скарыны, князёўны Прадславы.
Які гэта горад, абвеяны славай?

ілюстрацыі: Яніна Зайчанка (what.yanya.saw)

мяў
зараз цяжка, але так будзе не заўсёды!
мы побач з табой


і заўсёды гатовыя
цябе падтрымаць

Срэбраны звон цымбалаў

Музычная школа — тое месца, дзе дзеці вучацца нотнай грамаце, не баяцца сцэны, адрозніваць гукі інструментаў, творчаму падыходу, выбудоўваць узаемаадносіны ў калектыве і, вядома ж, дысцыпліне.

Мне здаецца, што ўсе, з кім я вучылася, былі не падобныя адзін на аднаго. Хтосьці надаваў больш часу вакалу, хтосьці рабіў акцэнт на сольнае выкананне на інструменце, хтосьці на кампазіцыю, а хтосьці любіў выступаць у складзе музычнага калектыву. Усе былі розныя, але ўсіх аб'ядноўвала адно — любоў да музыкі, творчасці, магчымасць быць не такімі, як усе, ствараць нешта сваё. Менавіта дзеля гэтага варта ісці ў музычную школу.

Я з ранняга дзяцінства любіла спяваць, таму і папрасіла бацькоў адправіць мяне ў музычную школу. Тады я яшчэ не ўяўляла, што вучыцца там — велізарная праца, якая не кожнаму пад сілу. І вось надышоў адказны момант: выбар інструмента. Фартэпіяна здавалася занадта банальным, гітара не надта прыцягвала, і тут мой позірк спыніўся на слове «цымбалы». У сем гадоў я яшчэ не ведала, што

гэта такое, але як толькі ўбачыла іх ужывую, зразумела: вось ён, той самы інструмент, і я гатовая прысвяціць яму шэсць гадоў свайго жыцця — прынамсі, мне тады так здавалася.

Спачатку было вельмі цяжка звыкнуць да таго, што, апроч звычайнай школы, у мяне з'явілася і музычная, якой таксама трэба надаваць шмат часу. З першага навучальнага года я рыхтавалася да канцэртаў: вучылася тэхніцы і эстэтычным паводзінам за інструментам. Гэта аказалася не так проста, як я думала.

Наступным узрушэннем для мяне было сальфеджыа або, як яго называла сама педагог, музычная матэматыка. Велізарная колькасць акордаў, пабудоў, музычных дыктантаў — усё гэта ледзь змяшчалася ў галаве дзіцяці, якое, як і ўсе ў гэтым узросце, было трохі лянівае. Але чым старэйшымі мы станавіліся, тым прасцей было сумяшчаць і арганізоўваць свой дзень, каб паспець усё, хоць нагрузка толькі расла.

У трэцім класе музычнай школы наступіў момант, якога чакаў кожны. Мая настаўніца па спецыяльнасці сказала, што мяне адпраўляюць на рэспубліканскі конкурс. Эмоцыі, якія я адчувала ў той момант, змясцілі ў сабе і радасць, і гонар, і трохі страх. Страх падвесці кіраўніка, школу, акампаніятара. Ён даў мне матывацыю працаваць, працаваць і яшчэ раз працаваць. Некалькі месяцаў руплівай працы, слёзы, таму што нічога не атрымлівалася, гатоўнасць кінуць усё, доўгія рэпетыцыі, якія затрымліваліся на гадзіну, а то і на дзве. Менавіта тады для мяне была важная падтрымка бацькоў, толькі дзякуючы ім я не здалася, дайшла да канца і не разышлася з музыкай увогуле. Нягледзячы на ўсе цяжкасці, з кожнай рэпетыцыяй атрымлівалася ўсё лепш, кожная нота набывала сваё асаблівае гучанне.

Надышла гадзіна Х, калі трэба было адкінуць усё сваё хваляванне. Конкурс юных музыкаў «Сымон-музыка» праходзіў у Стоўбцах, на радзіме Якуба Коласа — горадзе за восемдзясят кіламетраў ад Мінска. Дарога апынулася вельмі хуткай, а так хацелася адцягнуць момант самога выступу. І вось дзесяць хвілін да выхаду на сцэну. Адзінае, што я магла ў той момант, — зрабіць глыбокі ўдых, выкінуць усе думкі і з халоднай галавой зайграць так, як было ў маіх сілах. Так я і зрабіла. Першы крок па сцэне — і ўсе нервы зніклі: я адыграла ўсё чыста, без адзінай запінкі. Усе былі рады майму поспеху, але я была самай маленькай удзельніцай, і ніхто асабліва і не спадзяваўся на прызавыя месцы, бо астатнія дзяўчынкі былі старэйшыя за мяне, з больш складанай праграмай. Заставалася толькі чакаць.



Бліжэй да вечара майму тату патэлефанавала настаўніца па спецыяльнасці — уся сям'я замерла ў чаканні, здавалася, нават дыхаць баяліся.

Нарэшце тата развітаўся, па голасе было чуваць, што ён усхваляваны, але прагучала тое самае запаветнае слова — «першая».

Я плакала ад шчасця, скакала, бегала, крычала, абдымала бацькоў, проста не магла паверыць, што гэта не сон, што я, маленькая дзяўчынка, абышла ўсіх.

Пасля гэтага пачала надаваць цымбалам яшчэ больш часу. Пасля справаздачнага канцэрта, які праходзіў штогод у сярэдзіне мая, мяне заўважыла выкладчыца, якая займалася з ансамблем цымбалістак, і паклікала граць з імі з наступнага года. Гэтая навіна мяне проста агаломшыла, таму што заўсёды там гралі толькі найлепшыя музыканты з усяго нашага аддзялення, якія зачароўвалі сваёй гульнёй не толькі мяне, але і ўсіх, каму даводзілася бываць на іх выступах.

Першы занятак у новым навучальным годзе. Я здзівілася, чаму мяне папрасілі затрымацца, але, калі ўвайшла выкладчыца ансамбля, адразу зразумела, у чым справа. Мяне пазнаёмілі з усімі дзяўчынкамі. Як аказалася, яны ўсе вельмі прыязныя. Прыцягвала атмасфера, якая панавала падчас рэпетыцый, адчувалася, што да мяне ставяцца як да дарослага чалавека, улічваюць маё меркаванне, не было ніякага напружання.

Гульню ў такім музычным калектыве можна параўнаць толькі з палётам птушак. Усе адзін аднаго падтрымліваюць, у кожнага свая роля, а выступы з гэтым калектывам — самае чароўнае пачуццё — пачуццё свабоды.

Два гады з гэтымі выдатнымі дзяўчынкамі падарылі мне велізарны досвед. Мы выступалі на многіх вялікіх сцэнах нашага горада: Беларуская дзяржаўная філармонія, Канцэртная зала «Мінск» і г. д.

Цымбалы і сёння — досыць запатрабаваны інструмент, які вельмі шырока выкарыстоўваюць. Мала хто ведае, што на цымбалах можна граць не толькі народную музыку, але і класічную, і нават джаз.

Менавіта «музыкалка» навучыла мяне адказна падыходзіць да хатняга задання, падрыхтоўкі да канцэртаў і конкурсаў. Асабліва калі ты працуеш у калектыве, такім як ансамбль ці аркестр, ты адчуваеш, што не можаш нікога падвесці.

На выпускным вечары дырэктар у сваёй прамове сказала нам словы, якія я добра запомніла: «Далёка не ўсе з вас стануць музыкамі, але ўсё роўна, кім бы вы ні былі, вы будзеце адрозніваццa ад астатніх, таму што вы ўмееце чуць і разумець музыку».

Аляксандра Цітавец
ілюстрацыі: Яніна Зайчанка (what.yanya.saw)

Маргарыта Латышкевіч

Першая песня

Працяг. Пачатак у №2/2020

Сонца пякло яму ў галаву. Лель прыўзняўся на локці — і пабачыў знаёмае каменнае кола на вяршыні пагорка і чорны прысак, у якім яшчэ варочаліся дробныя пробліскі былога агню. Пахла мёдам, ніжэй па схіле гулі пчолы, і хвалі верасовага мора ленавата варушыліся пад ветрам. Неба за ноч паспела ачысціцца і цяпер ззяла радаснай сінню, і сонца прыпякала амаль па-летняму.

— Прачнуўся? — голасна спытаў лютніст, і Лель, здрыгануўшыся, павярнуў галаву на ягоны голас. Йурай, накінуўшы кароткі дарожны плашч, стаяў побач з адным з камянёў, і лютня ў скураным чахле прытулілася ў яго на плячы, гатовая да падарожжа.

— Дык гэта быў сон?.. — расчаравана спытаў Лель, калі яны адзін за другім спускаліся з пагорка па вузкай сцежцы. Йурай засмяяўся.

— Сон, — адказаў, паціснуўшы плячыма, — або ява. Выбірай, чалавечае дзіця.

— Я хацеў сказаць: гэта была… няпраўда? — Лель з лёгкай дрыготкай прыгадаў галасы рагоў у начным лесе. — Усяго толькі мроя?

— А чаму сон абавязкова мусіць быць няпраўдай? — гукнуўся Йурай, бліснуўшы на суразмоўцу ўсмешкай, і Лель змрочна засоп. У лютніста была дзівосная

манера адказваць на пытанні, не даючы, уласна, адказаў. Зрэшты, вытрымаўшы нядоўгае маўчанне, Йурай злітаваўся.

— Так, — мовіў, — ты цяпер звязаны зарокам. Так, ты цяпер мусіш выканаць тое, што паабяцаў Усёмаці. І так, яна, у сваю чаргу, абяцала забыць пра праклён і помсту.

— А што, — насмеліўся спытаць Лель, — што яна казала пра… спаборніцтва паэтаў?..

Йурай варухнуў бровамі.

— Хіба ёсць табе да гэтага справа? — спытаў лютніст. — Так або іначай, але я пакуль побач, а ў цябе дамоўленасць з Усёмаці. Толькі гэта і важна, не?

— Але… усё гэта быў сон?.. — азадачана нахмурыўся Лель. Зараз, удзень, ад успамінаў пра начное падарожжа накотвала вусціш, і дрыжыкі караскаліся па спіне. Бо калі гэта ўсё праўда — значыць, сіла той, што з'явілася ў Лелевым сне, не прыснёная, а самая сапраўдная. Значыць, святыні яе сапраўдныя. Значыць, тая старая ведзьма, адбіраючы ў вяскоўцаў дзяцей, аддаючы Лелеву малую сястру камяням, таксама была ў сваім праве.

З гэтым было цяжкавата змірыцца, і на душы ад усведамлення ўласнага бяссілля разліваўся холад. У свеце не-людзей, якія выпявалі закляцці ды ўмела знітоўвалі сон з яваю так, што і не адрозніш, чалавеку проста не было месца.

— Можа і так, чалавечае дзіця, — паціснуўшы плячыма, адгукнуўся Йурай, калі Лель з горыччу вымавіў перадуманае ўслых. — Але часы нашых чараў патроху мінаюць, і хутка мы ўсе будзем жыць у свеце людзей.

Лель прыснуў недаверлівым смяшком, але лютніст нават не ўсміхнуўся.

— Я *бачу,* — адказаў толькі, калі Лель пацікавіўся, адкуль такая ўпэўненасць.

Яны плячом да пляча крочылі між верасоў побач з дарогай, і лютніст уважліва паглядаў па баках, быццам шукаў нешта. Нахіліўся, нарэшце сарваўшы пару вялікіх суквецця ліловага верасу, пакруціў у пальцах, з сумневам узважыў кожнае на руцэ. Лель, чухаючы патыліцу, падумаў быў, што лютніст вышуквае травы для якогась зелля.

Адно Йурай, выбраўшыся на зарослыя каляіны, шпульнуў верасовую квецень на дарогу. А пасля, нахмурыўшыся, пусціў з вуснаў у дарожны пыл кароткае слова. Слова гэтае Лель не пачуў — толькі пабачыў у руху Йураевых вуснаў, у рабізне, што прабегла па паветры, у клубах пылу, што рэзка ўзняліся над каляінамі. За покрывам пылу варочалася на дарозе дзве цёмныя плямы з ліловым адлівам, і кожная паступова выцягвалася, падымалася, набывала форму. І раптам над верасамі прагучала тоненькае конскае ржанне, і капыты гарачых коней ударылі па дарожным пыле.

Лель захоплена глядзеў, як двое коней — вараных, з нябачнымі ліловымі пробліскамі ў поўсці — патрэсваюць шаўковымі грывамі і хвастамі, гарачацца, раздуваюць ноздры, прадчуваючы дарогу. Йурай патрапаў аднаго і другога верасовага скакуна па галовах — і яны азваліся прыязным фырканнем. Лель, усё яшчэ зачараваны, пакрочыў бліжэй, і коні нікуды не зніклі, а паўдзённае сонца лілося на іх крутыя бакі і точаныя шыі.

— Рушма, чалавечае дзіця, — прыспешыў Йурай, спрытна сядаючы верхам. — На дзвюх нагах далекавата давялося б ісці, а паспяшацца нам варта. Хіба што, — дадаў лютніст насмешліва, — Лель пажадае ісці на чатырох уласных нагах, а не

трэсціся ў сядле. — Ён, Йурай, зусім не супраць, калі на тое.

— У сядле, — таропка пагадзіўся Лель. Асцярожна пагладзіў скакуна па льсняным баку — і конь павярнуў галаву, дабрадушна косячы цёмным вільготным вокам. Жывая, рэчыўная істота, з плоці і крыві, быццам і не было ніякіх чараў, быццам не вырас толькі што з верасовага суквецця.

Конныя, яны рынуліся па дарозе цераз пусткі, і прапахлыя мёдам верасовыя хвалі імкліва замільгалі абапал дарогі. Замільгалі — і патроху адкаціліся, засталіся за спінамі, за звівамі дарогі. Пабеглі частыя ўзгоркі, зарослыя маладымі асінкамі, і на іх Лелю час ад часу кідаліся ў вочы белыя камяні, што быццам бы вартавалі дарогу. За бярозавым гаем паказаўся, бліснуўшы срэбрам вады, вольны разлог рачной даліны — і таксама ў хуткім часе застаўся ўбаку. Йурай, скарачаючы шлях на захад, скіроўваў коней патаемнымі сцежкамі, што спавівалі надрэчныя ўзвышшы. Верасовыя скакуны віхурамі праносіліся праз сырыя асіннікі, праз светлыя бярэзнікі, без высілку, без стомы пераскокваючы цераз бураломы ды неглыбокія раўчукі, што беглі ў рачную даліну.

Яны ўварваліся пад шаты пушчы, пад покрыва старадаўніх хвояў. Па медных ствалах языкамі агню разбягаліся вавёркі, і цені асцярожных аленяў праносіліся ў зялёным паўзмроку, за сухімі маліннікамі. Хваёвыя вершаліны трапяталі і шапталіся пад ветрам, тут, пад лясным покрывам, амаль незаўважным. Частыя плямы сонечнага святла павольна паўзлі па меднай кары, быццам кроплі смалы, і гусцелі, бо сонца патроху апускалася ніжэй, а дзень каціўся да вечара.

Каляіны дарогі паўзлі па пяску, і з-пад капытоў няўрымслівых верасовых коней узляталі высока ўверх драбочкі жоўтага жвіру і зжоўклай ігліцы. А пушча цягнулася далей і далей, раскідвалася, распроставалася, бясконцая, старадаўняя, вечная. У мажных хвояў шырока разрасталіся кроны, і дрэвы як бы распраўлялі плечы, цягнучыся да неба. Лель, удыхаючы густы смалісты водар, глядзеў на гэтых волатаў у меднай лусцы, што, мабыць, засталі яшчэ ягоных прашчураў, і думаў пра свет людзей, згаданы лютністам як непазбежнасць. І ад гэтых думак чамусьці шчымела сэрца, няхай сам Лель быў, несумненна, часткаю таго новага, чалавечага свету.

Даўняя пушча, дарма што падавалася бясконцай, урэшце адступіла-такі. Спачатку рассеяўся зеленаваты паўзмрок, тады радзейшымі сталі дрэвы, пасля замест векавых волатаў дарогу абступілі іх унукі і праўнукі, таксама моцныя, але без той спрадвечнай велічнасці ды магутнасці. З узлеску, дзе густой сцяной стаялі, цягнучыся з кустоўя да сонца, тонкія сеянцы, было добра відаць рэдкія пагоркі, зарослыя дубровамі, а між імі — адваяваную ў пушчы зямлю, лугі і палеткі. Пасвіліся авечкі, перарывіста звінела жалейка, і рэдкія разложыстыя дубы ды хвоі, пакінутыя пасярод поля, глядзелі самотна, сіратліва.

Тут, сярод гэтых прыручаных, змененых працоўнымі рукамі абшараў у лепшую долю для людзей, у будучыню, толькі для іх прызначаную, верылася. Прынамсі, верылася значна болей, чым на дзікіх пустках, дзе з верасовых суквецця́ў вырастаюць чароўныя коні, або ў вячыстай пушчы, чалавеку не падуладнай.

Над дубровамі пачынаў патроху налівацца барваю захад, а таму, трохі перавёўшы дыханне на ўзлессі, зрабіўшы па глытку з біклагі з травяным напоем, яны рушылі далей, несліся нястомна, быццам дзве верасовыя віхуры. Каляіны ацяжэлі, паглыбіліся, сама дарога заўважна раздалася ўшыркі і часта давала ад-

галінаванні. Тыя разыходзіліся то ўправа, то ўлева, беглі, кружачы, цераз палі і лугі, цераз дубровы, і было бачна, як у аддаленні падымаюцца ў неба дымы ачагоў. Гэта быў абжыты чалавекам, досыць густа заселены кут, і Лелю тым больш дзіўным падавалася, што чары не-людзей могуць мець тут сілу, ды і ўвогуле — існаваць тут.

— О, нашыя чары паўсюль, — адказаў Йурай на Лелева нясмелае пытанне, калі яны прыпыніліся на адным з раздарожжаў. — Мы жывем тут вельмі даўно, чалавечае дзіця. І нашыя чары, і мы частка гэтай зямлі.

— А як жа тыя «часы людзей»? — Лель перадаў лютністу яго біклагу і ацёр даланёю вусны. — Што ж тады будзе… з чарамі?..

Ён хацеў спытаць — «з вамі», але язык неяк не павярнуўся.

— Аднойчы ўсё заканчваецца, — адгукнуўся Йурай, памаўчаўшы. — Старое мусіць сысці, каб прыйшло новае. Такі лад рэчаў у свеце пад месяцам, чалавечае дзіця.

— І… — Лель зябка павёў плячыма. Яму чамусьці да болю шкада стала чараў, нязвыклых і прыўкрасных, і змяіных звіваў ліній на камянях, і верасовага мора на дзікіх пустках, — няўжо нічога нельга зрабіць?..

Йурай усміхнуўся.

— Часам я задаю сабе такое ж пытанне, — адказаў ціха, — але не ведаю адказу.

Верасовыя скакуны неслі іх далей і далей. У засені дубоў па пагорках часта бялелі стаячыя камяні, і тады ў вецер, апроч перашэптвання лісця, упляталіся ледзь заўважныя чалавечаму слыху зыкі. Лель, заплюшчваючы вочы, засяроджа-



на прыслухоўваўся — і чуў, адрозніваў, як цягнуцца і трымцяць даўнім глыбінным спевам срэбраныя ніці чараў, што сыходзілі з самой зямлі.

Што былі голасам гэтай зямлі.

Прошчы пелі і гаварылі — можа быць, між сабою, можа быць, гукаючыся з цёмнай пушчай, што ўсё аддалялася, аддзеленая апрацаванай зямлёй. І гэты спеў незаўважна быў паўсюль, дамешваўся да дробату капытоў і бразгання збруі, да крокаў ветру ў прыдарожных зарасніках, да перазвону вады ў соннай рачулцы, што давала нырца пад гулкі масток цераз глыбокі яр.

За ярам Йурай пусціў каня ступою. Лелеў скакун без аніякай указкі вершніка сцішыў хаду таксама, і зараз яны ехалі куды павольней, прыглядаючыся да ваколіцы. Магутныя дубы, у якіх дзе-нідзе пачынала ўжо залаціцца лісце, непарушна стаялі на пагорках, а часам і спускаліся ніжэй, ледзь не да самай дарогі. Мясцовыя, падобна, часцяком вырубалі тут векавыя дрэвы для ўласных патрэб, і Лель не без шкадавання глядзеў на разарэнне дубровaў: дубы яму падабаліся. І ўвогуле тутэйшы край падаваўся да дзіўнага блізкім, нечакана *сваім*, быццам Лель пасля доўгага падарожжа нарэшце вяртаўся дамоў.

— То мы едзем да прошчы? — спытаў Лель, асабліва не спадзеючыся на ўцямны адказ. Проста надакучыла маўчаць, ды і сама імклівая шматгадзінная скачка адзывалася і ў целе, і ў душы стомленасцю.

— Менавіта, — спакойна пацвердзіў Йурай.

— Бо там вашыя камяні… як гэта… болей не пяюць?

— Менавіта так, дзіця.



— І таму ты… вырашыў дапамагчы мне?..

— О, — Йурай пакруціў галавой, і падала голас завушніца, — не падманвайся. Я не дапамагаю *табе*. Мне, чалавечае дзіця, насамрэч мала справы да твайго праклёну.

— Але ж ты выправіўся разам са мной…

— Таму што так трэба, — перапыніў Леля лютніст. — Таму што гэта Яе воля. Таму што ўсё, што сустрэну на гэтым шляху, пасля наніжацца на ніці словаў і гукаў, стане музыкай для Курганова Поля. Ну, або таму, што чалавечых дзяцей трэба скіроўваць на шляху, іначай яны папросту не здолеюць дабрацца да месца. Выбірай, што болей падабаецца.

Лель пачухаў патыліцу, збіраючыся з думкамі.

— Таму што… ты нешта там такое пабачыў? — ціха мовіў ён, прыгадаўшы начную размову, і Йурай варухнуў цёмнымі бровамі і падціснуў вусны. Што б ён ні *ўбачыў*, распавядаць пра гэта лютніст не спяшаўся.

Коні мерна мясілі капытамі дарожны пыл, а Лель тым часам разважаў, зводзячы ў адно ўсе нітачкі здагадак. У яго хапіла клёку звязаць спеў камянёў у прошчах з чарамі не-людзей, і абрыў таго спеву з якой-кольвек прычыны, мусіць, азначаў разарваныя закляцці, разбітыя чары. Ясна, што не-людзям тое зусім не даспадобы, адно Лель трохі сумняваўся, ці будзе вяртанне кургановых чараў на карысць чалавеку. Дакладней, пра карысць ці шкоду чалавеку кургановы народ наўрад ці стане задумвацца.

З іншага боку, і людзі не дужа заклапочаныя лёсам тых, з Курганова Поля.

Пра халоднае жалеза Лель таксама прыгадаў тое-сёе, пакорпаўшыся ў памяці, успомніўшы вусцішныя бабуліны казкі. Быццам бы некалі самыя адважныя і ўмелыя ваяры людзей выкоўвалі адмысловую зброю для бітваў з народам курганаў. Звычайная сталь аднаго з агнявокіх не заб'е, і нават звычайны жалезны нож проста параніць. А вось загаворанае халоднае жалеза, нават яшчэ і не ўдарыўшы, цягне з не-людзей сілу, раз'ядае, як іржа, спляценні іхніх чараў, ломіць волю і рушыць сілу.

«То, можа быць, — Лель унутрана пахаладзеў, але ўсё-такі не мог пра гэта не падумаць, — можа быць, і добра, што даўняе загаворанае жалеза адабрала ў каменнага кола мову, разарвала ніці наведзеных чараў?..»

— Спеў камянёў, — загаварыў Йурай, быццам прачытаў у зацягнутым маўчанні Леля гэтае пытанне, — важны не толькі для нас, чалавечае дзіця. Як думаеш, чаму каменныя чары ўкрываюць усю гэтую зямлю? Чаму прошчы раскіданыя па самых глухіх кутках?

— Я не… — прамармытаў Лель, прысаромлены, адчуваючы, што яму і насамрэч зазірнулі ў не самыя годныя думкі. — Не, не ведаю. Чаму?..

— Таму што, — адчаканіў лютніст, — гэтыя чары аддзяляюць нас ад нечага, што страшнейшае за не-людзей. Або нават за чалавечых дзяцей.

— І што гэта? — Лель зацікаўлена прыўзняў бровы. — Тое страшнейшае-ат?

У перачутых ім бабуліных казках нічога такога не было, ды і Лелю цяжкавата было ўявіць штосьці болей жудаснае, чым Дзікі Гон. Ці чары, здольныя ператварыць чалавека ў звера. Ці… Тут Лель прыгадаў чорныя бездані ў зрэнках Той, у сне, які не быў сном, і скалануўся, быццам ад халоднага ветру.

— Можа быць, — нядобра ўхмыльнуўся лютніст, — гэта пачвары, што паглына-

юць тых, хто задае зашмат пытанняў?

Лель змрочна засоп. «А можа быць, — працягнуў ён пра сябе, перадражніваючы, — можа быць, ты проста не хочаш адказваць». Праўда, выпрабоўваць цярплівасць Йурая або нават і тых уяўных пачвар Лель не рашыўся і палічыў за лепшае замаўчаць.

Ваколіца, падобна, сапраўды была добра абжытая, бо чым далей, тым болей сустракалася ім людзей. Хтосьці працаваў у полі і паварочваўся на конскі бранль, прыглядаючыся да вершнікаў. Хтосьці прамінаў пратаптанымі сцежкамі да сяліб, несучы мяхі ці кошыкі, а то і вязанкі дроваў. Раз-пораз і вазы паўзлі па дарозе насустрач ці ў той жа бок, і суровыя барадатыя вознікі падазрона касіліся на нябачаных верасовых скакуноў.

Хутка за бліжняй дубровай паказалася ўмацаванае селішча, і на драўляных вежах за ўтравелымі рвамі танчылі пад ветрам барвовыя сцягі. Стуль несліся чалавечыя галасы, пах дыму і голас металу пад кавальскім молатам. Туды, да дыму і металу, паўзло некалькі цяжка нагружаных вазоў, грукаталі коламі па пад'ёмным мосце. Лель пытальна зірнуў на Йурая, але той адмоўна пахістаў галавой: іх дарога ішла далей на поўнач.

І чым далей яна ішла, тым больш занядбанымі, здзічэлымі станавіліся мясціны. За наступным жа раздарожжам пазнікалі дымы раскіданых па дубовых узгорках селішчаў. Не бялелі на схілах авечыя чароды, не падавала голасу жалейка. Хутка стала відавочна, што шлях сюды быў закінуты: каляіны зарасталі травою. Вакол раптоўна раскінулася бязлюддзе — зусім як на верасовых пустках — і расцякалася цішыня, даўкая, цяжкая, як бы пераднавальнічная. Зыкі каменных колаў, што ўпляталіся ў вецер, тут не гучалі, і нават птушыная драбяза ў прыдарожных зараснікаx не ўсчынала вясёлага перазвону.

Край быў безгалосы. Мёртвы.

— Адчуваеш, пэўна? — мовіў Йурай нягучна, і Лель часта паківаў. Ён сам не здолеў бы ўцямна патлумачыць, што іменна расцякалася вакол, але гэтае нядобрае адчуванне было самым рэчыўным і толькі мацнела, аблягаючы дваіх вершнікаў шчыльней.

— Мы блізка, — сказаў лютніст. — Будзь напагатове.

Верасовыя скакуны пафырквалі, трывожна стрыглі вушамі. Падобна, нядобрая ціша, якая затапіла ўсё вакол, ім таксама была не пад густ. Лель, шкадуючы, пагладзіў свайго каня па шаўковай шыі — і са здзіўленнем зразумеў, што нястомны звер, створаны чарамі, успуджана дрыжыць.

Можа, трывога ад каня перадалася і Лелю, бо праз пэўны час страх быў паўсюль, у самім паветры. Страх пранізваў і дубовае вецце, што спляталася над дарогай, і трапяткія галіны зараснікаў. Страх гучаў у голасе ракі, амаль цалкам укрытай, быццам схаванай за альхоўнікам. Страх варушыўся ў ценях ад вершнікаў, што клаліся на сухую траву, на багун і дурнап'ян. Між звівастых каранёў і зблытаных сцяблін варушыліся, быццам клубок, іншыя цені, якія слізгалі, сачыліся і сачылі пільнымі позіркамі. Лель заўважаў ламаныя рухі краем вока, паварочваў галаву — ды бачыў толькі старыя дубы і шапаткія травы. Але неспакой рос у ім, і пальцы мацней сціскаліся на аброці.

Напэўна, з той прычыны, знянацку згледзеўшы на ўзбочыне цёмную постаць, Лель ледзьве не ўскрыкнуў. А тая вусцішная постаць махнула рукою, просячы

іх прыпыніцца, і адразу ж ступіла на дарогу, ледзь не пад капыты верасовых скакуноў.

Зрэшты цёмнаю ды вусцішнай яна была толькі таму, што насіла плашч. Цяпер, калі Йурай і Лель спынілі коней, башлык упаў, адкрываючы растрапаную русую касу і жывы твар з яснымі шэрымі вачыма пад упартымі бровамі, з белаю паласою шрама ля пульхных вуснаў. Твар быў жаночы, ці дакладней, дзявочы, досыць юны, і Лель падумаў быў, што беднае дзяўчо згубілася і шукае дапамогі.

Адно толькі ў руках у яе быў рагавы лук, а на сцягне — калчан са стрэламі. Таму ані згубленай, ані безабароннай дзяўчына не выглядала, ды і загаварыла зусім без боязі, упэўнена, нават строга:

— Вы на поўнач едзеце? Дарма. За дубровай дарога зусім дзічэе, а далей там заклятае возера з нелюдскімі камянямі. То лепей паварочвайце.

«З нелюдскімі камянямі», — паўтарыў Лель шэптам, і яго ажно перасмыкнула. Занадта ярка прыгадаўся човен, што вёз іх з маленькай сястрою цераз начную раку, ікол маладзіка ў цёмным небе, і шлях па мокрым пяску, і ў грозным каменным коле — вычварная здань, хіжая да дзіцячай крыві.

— …а калі, — адказваў тым часам дзяўчыне Йурай, — калі менавіта тое заклятае возера ды нелюдскія камяні нам і патрэбныя, *чалавечае дзіця?*

Яна звузіла вочы, разглядаючы лютніста і верасовага скакуна пад ім, пасля кінула ўважлівы погляд на Леля, які міжволі ўнутрана сцяўся. Апошнім часам яму падавалася, быццам, гледзячы на яго, людзі лёгка могуць заўважыць заключанага ўнутры звера — і як звера пагоняць ад сябе.

— …то вы нелюдзі? — працягнула дзяўчо трохі расчаравана. — А і ўсё роўна: кажу, на возеры нядобра. Здані там. Паварочвайце, кургановыя, да душы. Нават і вас — шкада.

Йурай насмешліва чмыхнуў.

— О, гэтае чалавечае спачуванне, — сказаў, пахітаўшы галавою.

— А сама? — не стрываў Лель. — Сама нашто тут цягаешся, калі побач здані і страхі?

Яна паціснула плячыма.

— Палюю, — патлумачыла проста. — Сцежкі-та ведаю. Казулю, бач, няўдала падстрэліла, а яе ад спуду сюды панесла. Ішла па слядах, а тут вы. Ну, думаю, дай папярэджу, а то…

— Казулю, значыць, падстрэліла? — паспешліва перарваў яе Йурай. Дзяўчо паківала.

— Ну так, — адказала. — Блізка паўдня якраз, на сцежцы з вадапою. Схібіла трохі — слізганулі пальцы. Дык падранак і збег. Праз уласную дурасць давялося паўдня высочваць, вышукваць крывавы след на зямлі ды палым лісці.

Лютніст, пакуль дзяўчо распавядала, стрымана ківаў і яўна нешта абдумваў, паціраючы падбароддзе. Пасля спешыўся — і са скуранога чахла ад рэзкага руху сонна падала голас лютня. Дзяўчо, нахіліўшы галаву трохі набок, з бессаромнай цікаўнасцю яго разглядала: і франтаваты камзол, што паказваўся з-пад дарожнага плашча, і завушніцу, што знічкай мільгала ў светлых валасах.

— Сам-та не паляўнічы, нелюдзь, — сказала дзяўчо задуменна. — І нашто табе туды?

— То як там, след падранка ты знайшла? — трохі раздражнёна кінуў Йурай,

быццам і не пачуў пытання. — Далёка ён быў?

— Ды побач, — дзяўчо махнула рукой кудысь убок. — След да возера якраз спускаўся. Казуля нядоўга, мусіць, яшчэ пабегае: шмат крыві страціла.

— Неба бачыць, пабегае нядоўга, — пагадзіўся Йурай, усміхнуўшыся востра, па-ваўчынаму, і павярнуўся да Леля: — Хадзем. Цяпер асцярожна.

Лель нехаця саскочыў на зямлю. Лютніст, верагодна, меркаваў адсюль ісці пехатою, а набліжацца да жывых ценяў, што варушыліся вакол, адчайна не хацелася, ажно дрыжыкі беглі па скуры. Не столькі ад страху нават, колькі ад гідлівасці да вычварнага віравання ды сіплага перашэптвання.

— То ты што, нелюдзь, — дзяўчо прыўзняла брыво, — хочаш па следзе ісці? Кажу ж, занадта блізка ад возера. Я хоць ваколіцу сяк-так ведаю, а ўсё роўна туды не сунулася б.

— Мне ведаць не трэба, — адгукнуўся Йурай трохі звысоку. — Я *бачу*.

— А я бачу, — адказала дзяўчо, назнарок падладжваючыся пад ягоны тон, — што азёрныя крывасмокі ды відмы пакінуць ад дваіх нелюдскіх дурняў рожкі ды ножкі.

Йурай нахмурыўся: мабыць, не звык, каб з яго збівалі пыху, ды яшчэ і хтосьці з чалавечых дзяцей.

— *Нелюдскія* справы, — мовіў ён, чаканячы словы, — не для смяротных вачэй. То вяртайся да сваіх ачагоў, дзіця людзей, як хутчэй вяртайся, бо змрок хутка прыпадзе і здані выйдуць са сваіх сховаў. А ўвогуле тое, што тут адбываецца, як і шляхі народу курганаў, не твайго розуму справа.

— Не так вас нават, як вашых коней шкада, — мовіла ўпартае дзяўчо, хмурачыся не горш за лютніста. — Жывёла-та ў чым вінаватая?

У адказ Йурай працягнуў руку ў бок верасовых скакуноў ды зноў вымавіў тое слова без гуку. Прайшла рабізна па паветры, узвіўся дарожны пыл — і коні, якія толькі што білі капытамі па дарозе, развеяліся як мроя. Засталіся адно падсохлыя суквецці верасу на зарослых шорсткай травой каляінах.

— Не табе шкадаваць нас, — сказаў лютніст. — Ідзі сваёю дарогаю.

А дзяўчо ўражана глядзела туды, дзе толькі што стаялі верасовыя скакуны, і вусны ў яе былі дрогкія, быццам хацеў сарвацца выгук — ды не мог. Йурай адным нядбайным кіўком прыспешыў Леля і збочыў з дарогі ўпэўненым, пругкім крокам. Лелю нічога не заставалася, як паспяшацца за лютністам. Зрэшты ён дазволіў сабе азірнуцца на дзяўчо — і пабачыў, як тая нахінулася і асцярожна, двума пальцамі падабрала з дарогі кветкі верасу.

Лютніст ішоў хутка і лёгка, ступаючы па-ваўчынаму бязгучна. Побач з ім Лелю падавалася, быццам сам тупае аглушальна, штохвіліны натыркаецца на сухое вецце, спатыкаецца аб карані ды купіны. Драпежныя цені ўсё варушыліся ў цёмных кутках, паўзлі следам, і Лель адчуваў хіжыя погляды на спіне: яны калолі як атрутныя іглы.

Ці то дзяўчо правільна ўказала накірунак, ці то Йураева ваўчынае чуццё не падвяло, але і гадзіны не мінула, як яны выйшлі на след падстрэленай казулі. Йурай апусціўся на адно калена побач з зыркімі плямінамі пад тонкімі рабінкамі, вывучаючы сляды бліжэй. А Лель выразна пачуў, як узрыкваюць галодныя цені, як сквапна цягнуцца яны да яшчэ не астылай жывой крыві. І сам пачуваў сябе стомленым падранкам, за якім спяшаецца драпежнік. І думаў: а ці сапраўды варта

ім ісці за той параненай казуляй, калі тыя, галодныя, прагныя, неадступна крочаць па тым следзе таксама?

Лель нават паспрабаваў — шэптам — задаць гэтае пытанне лютністу. Той, аціраючы пальцы аб лісце арэшніку, пакруціў галавой, дзынкаючы завушніцай.

— Гэтыя — драбяза, — спакойна адказаў Йурай. — На гэтых ты нават не зважай, чалавечае дзіця. Горшае чакае наперадзе, вер мне.

«І чаму наперадзе заўжды горшае», — забурчаў Лель сабе пад нос, стараючыся не заўважаць няспынны рух льсняных драпежных ценяў па баках. Лютніст, пачуўшы ягонае бурчанне, крывенька ўсміхнуўся.

— Дурны верыць у шчаслівы выпадак, — мовіў. — Мудры рыхтуецца да горшага.

— То лепей, значыць, быць дурнем,— буркліва адгукнуўся Лель, — калі мудрацам усё роўна шчаслівых выпадкаў не свеціць.

На гэта лютніст адказаў прыдушаным смяшком.

— Паспрабуй, — параіў весела. — Раптам атрымаецца.

Неба паступова згасала над рабінамі, над зялёнымі шапкамі дубоў, і цені гусцелі, нахабна падкотваліся бліжэй і бліжэй. І цішыня гусцела таксама, налівалася варожасцю, ціснула на вушы, абляпляла твар, замінаючы дыхаць. Лель ледзь перастаўляў ногі, ідучы за Йураем, і часта аціраў пот з ілба, і ніяк не мог перавесці дыханне.

А пасля дубы расступіліся, і стала відаць светлыя хвалі возера, пафарбаваныя захадам. З узгорка, на якім яны прыпыніліся, ясна праступала ўнізе круглае азёрнае ложа, і скалісты астравок сярод хваляў, і пакатыя берагі ў касматай поўсці цёмнай травы. Далей пабліскваала рака — тая самая, мусіць, што бегла, укрытая алешнікам, уздоўж закінутай дарогі. На дальнім беразе відаць было колькі счарнелых ад часу і сырасці, добра патрапаных непагаддзю будынкаў, верагодна, закінутых. Калі нехта і спрабаваў тут абжыцца, то досыць даўно сышоў.

Працяг у наступным нумары

бярозка

Штомесячны грамадска-палітычны і літаратурна-мастацкі часопіс (для дзяцей сярэдняга і старэйшага школьнага ўзросту)
Выдаецца са снежня 1924 года
Узнагароджаны ордэнам «Знак Пашаны»

01 Праектар. Хочацца, каб гэтую кнігу больш не экранізавалі
04 Ініцыятыва. Ахова птушак Бацькаўшчыны
05 Гіт-zone. Каханне ёсць рызыка, ці Як выглядае аб'юз
09 Гісторыя поспеху. Пра тое, як чуць адзін аднаго
14 Месца. Гарады Беларусі
18 Школа журналістыкі. Срэбраны звон цымбалаў
21 Літаратурныя старонкі. Маргарыта Латышкевіч. Першая песня (працяг)

Аўтар вокладкі і разварота: Nollaig Lou (@nollaiglou).

Адказы да загадак на ст. 14-15:
Мінск, Гродна, Брэст, Нясвіж, Полацк.

Заснавальнік
Вытворча-выдавецкае рэспубліканскае ўнітарнае прадпрыемства «Дом прэсы»

Галоўны рэдактар:
Кацярына Вячаславаўна Каплун

Рэдакцыйная калегія:
Алесь Бадак, Валерый Гапееў, Алесь Дуброўскі, Уладзімір Ліпскі, Алена Масла, Міхаіл Мірончык, Людміла Рублеўская, Аляксей Чарота, Таццяна Швед

Адрас рэдакцыі
Юрыдычны і паштовы адрасы:
Рэспубліка Беларусь, 220013, г. Мінск,
вул. Б. Хмяльніцкага, 10а.
chas.bjarozka@gmail.com
Тэл.: 8 (017) 287-19-27, 8 (017) 287-16-98.

Падпісныя індэксы:
74822 — індывідуальны
74888 — індывідуальны льготны для членаў БРПА
748222 — ведамасны
74879 — ведамасны льготны для ўстаноў адукацыі і культуры

Пасведчанне аб дзяржаўнай рэгістрацыі сродку масавай інфармацыі №210 ад 25.07.2019, выдадзенае Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь

Выдавец:
Рэспубліканскае ўнітарнае прадпрыемства «Дом прэсы»
Дырэктар:
Фёдар Пятровіч Караленя

Намеснік галоўнага рэдактара:
С. М. Курганава
Мастацкі рэдактар, камп'ютарная вёрстка:
В. С. Дзяткова
Стыль-рэдактар:
П. У. Забела

Падпісана да друку 20.05.2020 г.
Фармат 60×84 1/8. Друк афсетны.
Ум. друк. арк. 3,72. Ул.-выд. арк. 3,42.
Тыраж 521 экз. Заказ ??.

Рэспубліканскае ўнітарнае прадпрыемства «БудМедыяПраект»
ЛП № 02330/71 ад 23.01.2014,
вул. В. Харужай, 13/61, 220123, Мінск, Рэспубліка Беларусь

© РУП «Дом прэсы», 2020

«Бярозка» ў сацсетках:
@bjarozka
@bjarozka.mag



ВЫЦІНАНКА «ЗЯЛЁНЫ ДУБ»

Аўтар: Вольга Бабурына (Palunisa)

Аўтарка фотаздымка: Trau (trau.erm)

ISSN 0320-7579

9 770320 757007 20005